скарабежнасць жыцця, бо нам здаецца, што жыццё доўгае і бацькі будуць побач з намі заўсёды. Але кожны чалавек сталее, пазбаўляючыся магчымасці быць звычайным дзіцём сваіх бацькоў, рэдка наведваецца ў госці ў свой дом, дзе ён нарадзіўся, пазнаў першую навуку жыцця, знайшоў вернага сябра і ўпершыню закахаўся. Аўтарская інтэнцыя У. Ліпскага, выказаная ў “Споведзі сына”, сугучная барадулінскаму “Трэба дома бываць часцей…”, і ў сцвярджэнні гэтай тэзы пісьменнік вельмі пераканаўчы.

### Літаратура


1. Ліпскі, У. С. Споведзь сына / У. Ліпскі . – Мінск : Харвест, 2011. – 512 с.
2. “Што раблю? – Жыццё люблю!” [Электронны рэсурс] // Уладзімір Ліпскі: сайт. – Рэжым доступу: http://www.lipskivs.by/lipski-biography.html. – Дата доступу: 22.02.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Станаўленне гатычнай традыцыі ў еўрапейскай і беларускай літаратуры


*А. А. Макарушка*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – М. С. Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры*



**Анатацыя.** У артыкуле вызначаюцца дамінантныя адметнасці гатычнага жанру ў еўрапейскай і беларускай літаратуры, разглядаецца станаўленне гатычнай традыцыі ў нацыянальным мастацтве слова.



**Ключавыя словы:** готыка; гатычная традыцыя; жанравая адметнасць; жах; таямніца; містыка.


Цікавасць чытачоў і пісьменнікаў да таемнага, містычнага, звышнатуральнага заўсёды была вядучай тэндэнцыяй, якая абумоўлівала станаўленне новых жанраў, з’яўленне новых твораў, адметнасць паэткі якіх заключалася якраз у квінтэсэнцыі жахлівага, незвычайнага, невытлумачальнага: “У гэтых творах настолькі моцныя рысы таямнічага і загадкавага, настолькі незвычайныя і казачныя апісанні, што яны ў значнай ступені дапамагаюць абудзіць ўсю моц ўяўлення, запоўніць вашу душу велічнымі і таямнічымі вобразамі” [3]. У еўрапейскай літаратуры готыка існуе больш за трыста гадоў, прапедэўтыкай яе станаўлення можна лічыць асобныя творы,

звязаныя з рыцарскай культурай Сярэднявечча і барочнай няўпэўненасцю ў заўтрашнім дні.

Непасрэдна гатычны раман як унікальная літаратурна-мастацкая з’ява ўзнік у Англіі на мяжы XVIII–XIX стст. у часы ранняга рамантызму. Тыпалагічна ён блізкі да традыцый фармальнага рэалізму XVIII ст.: стварэнне рэальнасці праз вопыт аднаго персанажа, даследаванне ўнутранай (а не знешняй) драмы асобы, яе свядомасці і ўспрымання.

Заснавальнікам гатычнага рамана стаў Хорас Уолпал, твор якога “Замак Атранта” да гэтага часу з’яўляецца папулярным у сучасных чытачоў. Росквіт жа готыкі ў літаратуры пачынаецца ў 90-я гг. XVIII ст., калі заходнееўрапейскае грамадства, сутыкнуўшыся з крывавым тэрорам і гвалтам, паспрабавала вызваліцца ад сваіх страхаў, увасобіўшы іх у жахлівых вобразах гатычнай літаратуры.

Асноўнымі асаблівасцямі гатычных твораў з’яўляюцца наступныя:

1) таямніца ў аснове сюжэта;
2) наяўнасць звышнатуральнага, якое не тлумачыцца логікай;
3) жахліва-вусцішны пачатак: “Жах – самае старажытнае і моцнае чалавечае пачуццё, а самы старажытны і самы моцны жах – жах невядомага. Наўрад ці хто-небудзь з псіхолагаў будзе гэта аспрэчваць і ў якасці агульнапрызнанага факта гэта павінна на ўсе часы пацвердзіць сапраўднасць і годнасць таямнічага, жудаснага аповеду ў літаратуры” [2];
4) выключныя асобы, незвычайныя знешне ці інфернальныя істоты (прывіды, ведзьмы, варажбіткі, монстры і інш.);
5) разгортванне падзей у напаўразбураных будынках і змрочных месцах: замках, на могілках, вежах, халодных пустках, закінутых дамах, літаральна наскрозь прасякнутых атмасферай вусцішнасці;
6) наяўнасць гераіні з паламаным або нешчаслівым лёсам.

У беларускай літаратуры станаўленне гатычнай традыцыі звязана з творамі Яна Баршчэўскага (“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”) і Вацлава Ластоўскага (“Лабірынты”). Сапраўдным майстрам неарамантызму, які папулярызаваў гісторыю, імкнуўся зацікавіць таямніцамі Беларусі неабазнаных у сівой мінуўшчыне чытачоў, з’яўляўся Уладзімір Караткевіч. Яго аповесць “Дзікае паляванне караля Стаха” і раман “Чорны замак Альшанскі” ўяўляюць сабой белетрызаваны аповед пра містычныя водгукі даўніны, загадкі, якія імкнуцца разгадаць героі.

Традыцыі У. Караткевіча ў аспекце міфалагізацыі мінулага годна працягвае Людміла Рублеўская. У гатычных апавяданнях “Шклянка цемры з прысмакам крыві”, “Дыярыуш пані”, “Жаніх пані Данусі” і інш. актыўна выкарыстоўваюцца элементы гатычнай паэтыкі: дзеянне адбываецца ў змрочных замках, сядзібах,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

касцёлах, на могілках, пераважна ноччу, у неспрыяльнае надвор’е, прысутнічаюць тагасветныя істоты, чытач запалоханы прадчуваннем блізкай трагедыі. Гатычны раман “Скокі смерці” – цікавая мастацкая знаходка пісьменніцы, “твор, які сінтэзуе элементы гатычнага, прыгодніцка-дэтэктыўнага, філасофскага раманаў, у якім удала злучаны нацыянальна-гістарычныя (этнанацыянальная самаідэнтыфікацыя беларусаў, захаванне гістарычнай памяці) і так званыя вечныя праблемы (пачуццё і доўг, вернасць)” [1, с. 150].

Такім чынам, адметнасцю гатычнага жанру з’яўляюцца вусцішныя краявіды, разбураныя старажытныя замкі, напоўненыя прывідамі і зданямі, таямнічыя сутарэнні, бандыты і харызматычныя злодзеі, гіпербалізацыя прадчування жахлівых нечаканых падзей і жудасныя вобразы фізічнай дэградацыі і энтрапіі як наступстваў родавага праклёну ці страшнай сямейнай таямніцы.

### Літаратура


1. Бароўка, В. Ю. Раманы Людмілы Рублеўскай як мастацкі дыялог з жанравай традыцыяй / В. Ю. Бароўка // Białorutenistyka Białostocka. – Т. 7. – Białostock. – 2015. – С. 147–160.
2. Лаўкрафт, Г. Сверхъестественный ужас в литературе [Электронный ресурс] // Г. Лавкрафт. – Режим доступа: http://lib.ru/INOFANT/LAWKRAFT/sverhestestvennyj_uzhas_v_literature.txt. – Дата доступа: 23.03.2019.
3. Watt, I. The Rise of the Novel [Electronic resource] // I. Watt. – Mode of access: http://www.uni-koeln.de/phil-fak/englisch/lehre/downloads/ essaythemen_ma.htm. – Date of access: 23.03.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Асоба мастака праз светаадчуванне В. Карамазава

*А. К. Пекач, К. А. Дзеравянка, Д. А. Ільянкова*

*Ліцэй № 2 (Мінск)*

**Анатацыя.** У артыкуле вызначаецца сутнасць паняццяў “аповесць-эсэ”, “мастацкі вобраз”, “эскіз”, “эцюд”, “споведзь”, “рэтраспекцыя”, раскрываецца ідэйна-эстэтычная значнасць выяўлення творчай асобы В. Бялыніцкага-Бірулі ў аповесці-эсэ В. Карамазава “Крыж на зямлі і поўня ў небе”, выяўляюцца сродкі раскрыцця творчай асобы мастака.

**Ключавыя словы:** аповесць-эсэ; творчая асоба мастака; ідэйна-эстэтычная значнасць; слоўнае апісанне.